**Аляксандраў, Л.** Сорак чацвёрты год / Л. Аляксандраў // Сцяг працы (Мёры). – 1983. – 9 мая. – С. 2–3.

## СОРАК ЧАЦВЁРТЫ ГОД

На паліцах нашых кніжных магазінаў з’явіўся апошні, трэці том выдання «Усенародны партызанскі рух у Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – ліпень 1944). Дакументы і матэрыялы» (Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1982). Называецца ён «Усенародны партызанскі рух у Беларусі на завяршальным этапе» і ахоплівае перыяд са студзеня па ліпень 1944 года.

У трэці том зборніка ўключана 357 дакументаў, якія ўсебакова адлюстроўваюць накіроўваючую ролю Камуністычнай партыі, падпольных камітэтаў і арганізацый па павышэнні эфектыўнасці ўзброенай барацьбы ў тыле ворага, развіццё і ўдасканаленне супраціўлення акупантам на тэрыторыі рэспублікі, у час масавага выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў з савецкай зямлі. Многія матэрыялы дазваляюць нам лепш зразумець падзеі, якія адбываліся і ў нашых мясцінах у гэты перыяд, больш аб іх даведацца.

У пастанове СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) «Аб бліжэйшых задачах Саўнаркома БССР і ЦК КП(б) Беларусі», прынятай 1 студзеня 1944 года, ЦК КП(б)Б абавязваўся «працягваць на захопленай ворагам тэрыторыі работу па раздуванню ўсенароднага партызанскага руху, па актывізацыі партызанскай барацьбы і дэзарганізацыі тылу праціўніка, па ўзмацненню дапамогі наступаючай Чырвонай Арміі, па выратаванню насельніцтва ад знішчэння і ўгону ў рабства, па захаванню населеных пунктаў ад спальвання нямецкімі захопнікамі.

Падпольным партыйным арганізацыям Беларусі яшчэ шырэй разгарнуць палітычную работу сярод насельніцтва акупіраваных раёнаў, мабілізуючы яго на актыўны ўдзел у барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў…».

Гэтыя надзённыя патрабаванні не толькі былі пачуты за лініяй фронту. Яны сталі кіраўніцтвам да дзеянняў падпольных партыйных органаў. 28 студзеня 1944 года начальнік ваеннааператыўнага аддзела пры Вілейскім падпольным абкоме КП(б)Б Ф. Г. Маркаў падпісвае загад № 59 аб арганізацыі абласнога агітатрада імя А. М. Горкага для правядзення дакладаў, лекцый і гутарак аб міжнародным становішчы, становішчы на фронце, у савецкім тыле, перамогах Чырвонай Арміі і мэтах партызанскай барацьбы, для паказу мастацкай самадзейнасці. Агітацыйную работу ўзмацняюць усе партызанскія атрады, падпольныя групы, патрыёты-антыфашысты. І не выпадкова камандуючы нямецкімі ахоўнымі войскамі ў Беларусі ўстрывожаны: «З улікам абстаноўкі… – дакладвае ён начальству ў студзені 1944 года, – трэба разлічваць на далейшы рост дыверсійнай дзейнасці, асабліва на чыгуначных лініях… Гэта ж трэба сказаць і аб раёне на ўсход і на паўночны ўсход ад Вілейкі». Так, размова ідзе аб нашых мясцінах.

Скупыя радкі дакументаў тых часін расказваюць аб адказе народных мсціўцаў на заклік Камуністычнай партыі, якога чакалі і так баяліся акупанты.

Сакратар па прапагандзе Дзісненскага падпольнага райкома ЛКСМБ М. М. Крашэўскі дакладвае Вілейскаму падпольнаму абкому камсамола, што ў 4-ай Беларускай партызанскай брыгадзе дзейнічала 7 пярвічных арганізацый, сакратарамі якіх з’яўляліся Ф. Т. Глазкін (пры штабе), Ф. С. Воднева (атрад № 1), С. Утко (№ 2), М. Радзіёнаў (№ 3), Ф. Якаўлеў (№ 4), М. Т. Глазкін (№ 5),

Вальштэйн (№ 6). У іх радах 144 члены ВЛКСМ, сярод якіх 28 дзяўчат. За справаздачны перыяд у камсамол прынята 13 чалавек і рэкамендавана ў партыю – 10, прадстаўлена да ўрадавых узнагарод 11.

У атрадах праведзена 11 сходаў, на якіх абмяркоўваліся пытанні актывізацыі барацьбы з захопнікамі, работы з несаюзнай моладдзю, сярод партызан і насельніцтва.

Агітацыйна-масавая работа накіроўвалася на разгортванне ўсенароднай барацьбы з акупантамі і праводзілася неадрыўна ад баявой дзейнасці. 39 агітатараў-камсамольцаў арганізавалі 136 дакладаў і гутарак сярод партызан і насельніцтва па дакладу І. В. Сталіна аб 26-ай гадавіне Вялікага Кастрычніка, яго кнізе «Аб Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюза», аб поспехах Чырвонай Арміі, савецкім тыле, дапамозе насельніцтва народным мсціўцам і інш. Актыўна ўдзельнічалі ў выхаваўчай рабоце Воднева, Палкоўнікаў, С. Утко, Латоцкі М., Радзіёнаў, Ф. Якаўлеў, Яўсееў, М. Глазкін, Шагонаў, О. М. Вальштэйн і іншыя.

У атрадах выпушчана за справаздачны перыяд 13 насценных газет, 19 «баявых лісткоў», у якіх расказвалася аб лепшых партызанах, крытыкаваліся недахопы.

23 камсамольцы з’яўляліся агітатарамі ў вёсках. Яны арганізоўвалі гутаркі і даклады. Ім дапамагалі дакладчыкі, баявыя групы, якія праходзілі праз населеныя пункты. Сумесна яны распаўсюдзілі 194 лістоўкі, 280 зваротаў, 59 газет. Такая работа дазволіла ўстанавіць цесныя сувязі з насельніцтвам, якое ў большасці не выконвала загады нямецкіх улад і дапамагала партызанам у разведцы, узбраенні, забяспечвала іх харчаваннем, адзеннем, абуткам.

У брыгадзе было створана 6 асобных камсамольскіх падраздзяленняў, якія разам з усімі партызанамі ўдзельнічалі ў ваеннай і санітарнай вучобе, авалодвалі падрыўной справай і зброяй, удзельнічалі ў баявых аперацыях. Напрыклад, 4 студзеня камсамолец І. Латгоцкі з групай пусціў пад адхон варожы эшалон з жывой сілай і тэхнікай на чыгунцы Маладзечна – Полацк каля станцыі Зябкі.

Камсамольцы М. Офман, Епіфанаў, Аборын, А. Кісель, З. Гелован у гонар 25-годдзя БССР знішчылі 13 кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі на бальшаках Міёры – Глыбокае і Міёры – Друя, спалілі мост на чыгунцы Друя – Дукшты.

Члены ВЛКСМ Ю. Манцэвіч, І. Аборын і Б. Дзімееў праніклі ў Міёры, дзе ўзарвалі машыннае аддзяленне на фабрыцы. Тое ж самае на млыне ў Дзісне зрабілі Е. Антонаў і В. Яўсееў.

На двух пасяджэннях бюро РК ЛКСМБ вёўся прыём у камсамол, даваліся рэкамендацыі для ўступлення кандыдатамі ў члены ВКП(б), абмяркоўвалася пытанне аб авангарднай ролі камсамольцаў.

Партызаны актыўна перашкаджалі нямецкім перавозкам па чыгунцы. З 1 па 5 лютага многія злучэнні ўдзельнічалі ў «рэйкавай вайне» на чыгуначнай лініі Полацк – Маладзечна. Партызаны брыгады «Кастрычнік» узарвалі 315 рэек, Смаленскага партызанскага палка – 348, а ўсяго – 4786. Рух эшалонаў быў спынены на 8 сутак.

Святкаванне 26-ай гадавіны Чырвонай Арміі, Міжнароднага дня 8 Сакавіка таксама выкарыстоўваліся для актывізацыі барацьбы з ворагам.

Сакратар Вілейскага падпольнага абкома ЛКСМБ П. М. Машэраў паведамляў, што на 1 сакавіка 1944 года ва ўсіх раёнах вобласці створаны падпольныя райкомы камсамола. Моладзь актыўна ўдзельнічала ў партызанскім руху. Агітатрад імя Горкага за студзень і люты даў 97 канцэртаў і падрыхтаваў 25 вечароў, на якіх прысутнічала 35 тысяч чалавек.

Партызаны атрымлівалі вялікую дапамогу боепрыпасамі, зброяй, медыкаментамі. Напрыклад, толькі праз аэрадром 4-й Беларускай партызанскай брыгады ў сакавіку паступіла 8966 кілаграмаў грузаў.

Народныя мсціўцы нарошчваюць удары па ворагу. 4-я Беларуская партызанская брыгада ў сакавіку вядзе актыўныя баявыя дзеянні, накіраваныя на зрыў мерапрыемстваў па мабілізацыі насельніцтва ў так называемую «Беларускую краявую абарону», перашкаджала захопнікам рабаваць мясцовых жыхароў. Выстаялі народныя мсціўцы і ў баях, звязаных з праводзімай ворагам аперацыяй па ліквідацыі партызан у Полацка-Лепельскай зоне.

Больш падрабязна даведацца аб дзеяннях 4-й Беларускай партызанскай брыгады ў гэты час нам дазваляе справаздача камісара Фамы Маркавіча Расюка, які са снежня 1943 года па ліпень 1944 года адначасова з'яўляўся сакратаром Дзісненскага падпольнага райкома партыі, а затым да жніўня – сакратаром Дзісненскага РК КП(б)Б.

Але спачатку некалькі слоў аб самім Ф. М. Расюку. Фама Маркавіч нарадзіўся ў 1900 годзе ў вёсцы Калыбань Рэчыцкага павета. Член КПСС з 1933 года. Працаваў старшынёй калгаса, старшынёй сельсавета. У 1942 годзе пайшоў у партызаны. Мае ўрадавыя ўзнагароды. Цяпер жыве ў Салігорску.

Ф. М. Расюк паведамляе, што на 1 мая 1944 года ў брыгадзе налічвалася 938 чалавек. Папаўненне за красавік – 255 партызан. Ствараюцца рэзервы далейшага росту. Маральны настрой асабовага складу добры.

У 7 партыйных арганізацыях брыгады налічвалася 111 камуністаў. За апошні месяц у члены ВКП(б) прыняты Цімафей Пятровіч Шарыпаў, у кандыдаты – Аляксандра Міхайлаўна Манцэвіч, Іван Іванавіч Разанаў, Мікалай Дзмітрыевіч Лапшын. 7 красавіка загінуў камуніст Мікалай Фёдаравіч Рассамахін, перапраўлены за лінію фронту параненыя і хворыя кандыдаты ў члены партыі Ніна Ягораўна Карасёва, Ганна Паўлаўна Іванова, Васіль Іванавіч Дудзін, Мікалай Трафімавіч Ярмакоў, Ефрасіння Міхайлаўна Пруднікава.

У красавіку створана партыйная арганізацыя ў 4-м атрадзе, сакратаром якой выбраны Хрыстафор Міхайлавіч Гладкоўскі.

Авангардная роля і аўтарытэт камуністаў вялікія. Сярод 87 прадстаўленых да ўзнагарод 63 члены партыі.

Камсамольцы на сходах абмяркоўвалі пытанні перадмайскага спаборніцтва, справаздачы агітатараў і камандзіраў аддзяленняў. Разам з камуністамі яны вывучалі Статут ВКП(б). Камсамольцамі ў кастрычніку сталі Малаток і Шчарбіцкі.

У баях з захопнікамі вызначыліся камуністы В. К. Іваноў, С. Т. Парасенка, А. Г. Шалаў, В. П. Сукрысцік, камсамольцы Рутштэйн, Лючонак, С. Замараеў, М. С. Федарэнка, Саўкоў.

І ў тыле ворага праводзілася палітычная вучоба камуністаў. Штодзённа адбываліся гутаркі ў узводах, атрадах па матэрыялах, прысланых з-за фронту і мясцовых фактах.

У раёне, кантралюемым брыгадай, у варожых гарнізонах дзейнічала і вяло разведку 20 антыфашысцкіх груп, у якіх налічвалася 85 чалавек, і 9 камсамольска-маладзёжных груп, дзе былі 32 члены.

У красавіку ў атрадах выпушчана 12 насценных газет, а ва ўзводах рыхтаваліся «баявыя лісткі». Друкарня за месяц надрукавала 1780 экзэмпляраў газет і лістовак, якія распаўсюджваліся ў навакольных вёсках і варожых гарнізонах. Сярод гэтых выданняў былі 25, 26 і 27 нумары газеты

«Народный мститель», выпушчаныя 9, 22 і 30 красавіка тыражом 330 і 240 экзэмпляраў, лістоўка «Хто ідзе з немцамі, той гіне» (4 красавіка, 320 экз.), зводка Савінфармбюро (14 красавіка, 300 экз.). Зварот да насельніцтва часова акупіраваных нямецкімі захопнікамі раёнаў Савецкай Беларусі Савета Народных Камісараў Беларускай ССР, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б (18 красавіка, 350 экз.).

Газета «Народный мститель» – орган Дзісненскага падпольнага райкома КП(б)Б. Выдавалася з лютага па май 1944 года. Выходзіла яна і пад назвай «Кліч партызана». Усяго вядома 8 нумароў, рэдактарам якіх з'яўляўся А. С. Іваноў.

У 68 вёсках кожны тыдзень партызанскія агітатары праводзілі гутаркі па зводках Савінфармбюро, а ў варожыя гарнізоны і населеныя пункты паблізу іх гэтыя зводкі засылаліся.

Штабы партызанскіх атрадаў з'яўляліся нібыта савецкімі ўстановамі, куды насельніцтва ішло за вырашэннем розных пытанняў, асабліва зямельных. Яны сталі арганізатарамі сяўбы азімых восенню 1943 года і яравых вясной, сцвярджаючы, што ўборка пройдзе ўжо без захопнікаў. Дапамагалі ў правядзенні гэтых работ. У партызанскія зоны пераязджалі сем'ямі, з гарнізонаў са зброяй у руках сюды ўцякалі адурманеныя фашысцкай прапагандай.

Захопнікі неаднаразова арганізоўвалі вылазкі на партызанскую зону, але заўсёды атрымлівалі адпор. Таму іх дзеянні набывалі ўсё больш вытанчаны характар. Так, у 1944 годзе з-за Заходняй Дзвіны з'яўляліся паліцэйскія, якія дзейнічалі «пад марку» партызан. 19 красавіка яны арганізавалі засаду ля вёскі Узмёны. 20 красавіка – абрабавалі насельніцтва вёсак Басяныя, Сушкі, Мальцы, дзе расстралялі 8 чалавек.

Паведамленне Савінфармбюро ад 2 мая 1944 года: «Некалькі вілейскіх партызанскіх атрадаў у красавіку пусцілі пад адхон 11 воінскіх эшалонаў і адзін бранепоезд праціўніка. Акрамя таго, савецкія патрыёты ўзарвалі 18 мастоў на шашы і выразалі 60 кіламетраў тэлеграфна-тэлефоннай лініі сувязі».

У ноч з 19 на 20 чэрвеня 1944 года пачаўся трэці заключны этап «рэйкавай вайны». У ёй удзельнічалі партызанскія злучэнні, якія дзейнічалі на тэрыторыі нашага раёна. Яны паралізавалі рух на чыгунках Полацк – Маладзечна, Крулеўшчына – Варапаева – Вільнюс.

У баях за поўны разгром ворага павысілася баявая актыўнасць партызан. Нягледзячы на цяжкую блакаду, 4-я Беларуская брыгада захавала баяздольнасць. Яна напала на адступаючыя калоны праціўніка на бальшаку Германавічы – Міёры і з баямі заняла некалькі населеных пунктаў, дзе знішчыла 23 і ўзяла ў палон 76 немцаў, падбіла 3 аўтамашыны.

Сакратары Вілейскага падпольнага абкома КП(б)Б І. Ф. Клімаў і А. А. Манахаў паведамлялі, што ў час праходжання перадавых часцей нашых войск па Міёрскаму, Шаркаўшчынскаму, Браслаўскаму раёнах амаль у кожнай вёсцы сяляне выносілі на вуліцу накрытыя святочныя сталы. І старыя, і малыя з радасцю сустракалі Чырвоную Армію.

Публікацыя новых дакументаў аб усенароднай вайне супраць акупантаў дае магчымасць яшчэ больш яскрава ўявіць маштабы партызанскага руху, у тым ліку ў нашых родных мясцінах. Яны дапамагаюць далейшаму пошуку краязнаўцаў. Наш абавязак упісаць у старонкі летапісу Міёршчыны кожны факт, кожную падзею, кожнае імя.

**Л. АЛЯКСАНДРАЎ**